**Культура і інвестар:** грані сацыяльнага партнёрства

# Стомільённыя "ўліванні"

**У мінулым нумары "К" мы казалі ўжо, што пачала дзейнічаць Рэспубліканская камісія па вызначэнні лепшай аграгарадоцкай установы і наданні ёй статуса "Клуб года". На Гродзеншчыну 14 — 15 верасня скіраваліся каардынатар праекта "Клуб года" і начальнік аддзела міжнароднай і сацыякультурнай дзейнасці Інстытута культуры Беларусі Лілія Жмачынская, дэкан факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Мікалай Каралёў, загадчык кафедры менеджменту сацыякультурнай сферы БДУКіМ Аляксандр Сцепанцоў, дацэнт кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін ІКБ Аксана Катовіч, а таксама аўтар гэтых радкоў...**

**Мы пабывалі ў аграгарадках "Пагародна" Воранаўскага і "Верцялішкі" Гродзенскага раёнаў. Клубныя ўстановы — абсалютна рознай "вагавой катэгорыі" і па эканамічным, і па геаграфічным становішчы. Не бяруся вызначаць лепшую. Гэта, урэшце, зробіць напрыканцы лістапада бягучага года рэспубліканская камісія. Паспрабую паказаць прыярытэтнасць клубнай дзейнасці. Калі доўжыць спартыўную тэрміналогію, дык усе 12 намінантаў на званне "Клуб года" ўжо здолелі трапіць у рэспубліканскую "вышэйшую лігу", і вопыт, назапашаны гэтымі клубнікамі, для іхніх калег у рэспубліцы — проста неацэнны. Вопыт дзвюх устаноў, які яскрава адлюстроўвае агульнараённую культурную стратэгію, і стаў галоўнай тэмай гэтага артыкула.**

Касцёл Святога Георгія ў Асаве — адзін з пунктаў турмаршруту Воранаўшчыны.

"Дарогамі продкаў"

Так называецца турыстычны маршрут, які распрацавалі культработнікі аграгарадка "Пагародна". Паблізу, у вёсцы Асава, гасцей вабіць неагатычная архітэктура стогадовага касцёла Святога Георгія і арганныя канцэрты ксяндза Яна. А ў Пагародне ёсць капліца ў стылі ракако, узведзеная ў XVIII стагоддзі...

Па словах старшыні Воранаўскага райвыканкама Мікалая Розума, самым бліжэйшым часам турыстычны рух у названых мясцінах павінен набыць цалкам рэальнае аблічча. Прынамсі, улады робяць для гэтага многае. Так, адпаведнай інфраструктуры пакуль бракуе. Але раён, які цягам 148 кіламетраў мяжуе з краінамі Еўрасаюза, мае сярод насельнікаў прадстаўнікоў 24 нацыянальнасцей, а таму і магчымасцей для атрымання самых розных трансгранічных грантаў тут — больш чым дастаткова.

Пра турперспектывы Воранаўшчыны "К" пісала шмат. Ужо цяпер турыстаў вабяць мясціны, звязаныя з Адамам Міцкевічам і Марыляй Верашчака ў Больцініках, з яўрэйскім прапаведнікам Хаімам Хафецам у Радуні, з домам-крэпасцю ў Гайцюнішках... Па словах старшыні райвыканкама, на Воранаўшчыне — каля сотні хутароў, у кожнай вёсцы — адмысловыя касцёлы, ёсць ужо 14 аграсядзіб. Праўда, з мясцовым аддзелам культуры шчыльна супрацоўнічаюць пакуль толькі дзве з іх. Як перакананы Мікалай Розум, сітуацыю неабходна змяняць карэнным чынам. Дзяржаўна-прыватнае партнёрства, урэшце, — адзін з генеральных кірункаў нашай унутранай палітыкі. Яшчэ адна неадкладная задача — пошук турінвестараў. І яны на Воранаўшчыне пакрысе з'яўляюцца. Калегі з літоўскага горада Аліпуса гатовы спансіраваць Міцкевічаўскі фестываль, яўрэі свету прапаноўваюць спансіраваць узвядзенне Культурнага цэнтра ў Радуні. Развіццю маршруту ў Пагародне, па словах старшыні Пагародзенскага сельсавета Вольгі Сінельнікавай, усяляк спрыяе дырэктар КСУП "Эксперыментальная база "Пагародная" Раман Цыдзік. Фінансавыя ўліванні ў мясцовую культуру мо і не надта вялікія, але — пастаянныя.

"Быццавым" пераўтварэнні

Ох, невыпадковае прозвішча ў старшыні Воранаўскага райвыканкама Мікалая Розума! Ён вельмі "хварэе" за сацыяльна-культурную справу, шмат робіць для таго, каб спрычыніліся да яе прыватнікі. Менавіта пры чынным удзеле Мікалая Аркадзьевіча Пагародна стала ў 2007 годзе аграгарадком. Былы Дом быту пасля грунтоўнай рэканструкцыі прыняў пад свой дах клубную ўстанову, бібліятэку і філіял ДШМ. Пры такім яднанні сацыяльнае партнёрства пачало прыносіць канкрэтны плён.

Справа ў тым, што пад час пастоў каталіцкая моладзь, мякка кажучы, не імкнецца на дыскатэчныя вечары. Альтэрнатыву знайшлі ў сумесных творчых праектах, да якіх пад клубнай эгідай падключыліся супрацоўнікі ўсіх сацыякультурных устаноў. Так з'явіліся арганныя канцэрты ў Асаве, дзе за грошы прыхаджан колішняя крама была пераабсталявана ў канцэртную залу, а сажалка з крынічкай ля касцёла пераўтварылася ў папулярную зону адпачынку. А ў Пагародне які ўжо год ладзяцца

## Пагародзенскі сельскі цэнтр дасугу і народнай творчасці:

# шукаем спонсараў і робім сайт

**У зоне абслугоўвання ўстановы — 19 вёсак з насельніцтвам больш чым паўтары тысячы чалавек. Дзейнічае 10 клубных фарміраванняў, у тым ліку ўзорны тэатр-студыя гульні "Гульнёвы кірмаш". Пры Цэнтры ёсць школа ткацтва, этнаграфічны пакой-музей. Пад адным дахам з клубнай установай працуюць філіял ДШМ і сельская бібліятэка. Гадавы план па аказанні платных паслуг — больш за 11 мільёнаў рублёў — Цэнтр паспяхова выконвае.**

На Пагародзенскім кірмашы.

Старшыня Воранаўскага райвыканкама Мікалай Розум ля Пагародзенскага цэнтра дасугу і народнай творчасці.

Начальнік аддзела культуры Воранаўскага райвыканкама Алена Ястрэмская (справа) на Пагародзенскім кірмашы.

кірмашы, дзе збіраюцца сельгасвытворцы ды культработнікі з усяго раёна, і разам з бульбай ды гарбузамі рэалізоўваюць арт-прадукт і рамесніцкія сувеніры...

Дык чым жа адметны мясцовы цэнтр дасугу і народнай творчасці? Найперш тым, што тут працуюць з усімі без выключэння ўзроставымі катэгорыямі насельніцтва. Асаблівае стаўленне — да выхавання дзяцей з няпоўных сем'яў, да так званых цяжкіх падлеткаў. Без узорнага тэатра-студыі "Гульнёвы кірмаш" абласны рэгіянальны фэст "Карнавал весялосці" проста не абыходзіцца. Я размаўляў і з дзецьмі Пагародна, і з моладдзю, і з людзьмі сталага веку — літаральна ўсе лічаць Цэнтр месцам уласнага і адхлання, і разняволення. Паверце, радкі сельскі клуб можа пахваліцца такой "рознаўзроставай" аўтарытэтнасцю.

Ці патрэбны клубу форум?

Дэкан факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці БДУКіМ Мікалай Каралёў запытаўся, ці ёсць у сельскай установы свой сайт — інтэрактыўны, яркі, прэзентатыўны. Мясцовыя супрацоўнікі пагадзіліся: калі гаворка — пра развіццё вясковага турызму, дык без сайта проста не абысціся. Так, ён ёсць у Воранаўскага райвыканкама, дзе культуры адведзена некалькі інфармацыйных старонак, якія пакуль не распавядаюць ні пра патэнцыйныя турмаршруты, ні пра будучыя культурныя паслугі з разбіўкай па сельскіх клубных установах...

Цудоўна разумею, што гэта не віна Воранаўскага раёна (дый не адно яго), а бяда. Мы яшчэ толькі, на жаль, вучымся піярыць тое, ад чаго ў тым жа Еўрасаюзе даўно і ўстойліва атрымліваюць дывідэнды, і не толькі маральныя. Між тым, пытанне "Ці патрэбны клубу сайт?" даўно ўжо мае канкрэтны адказ: "Такой установе, як Пагародненскі сельскі цэнтр дасугу і народнай творчасці, сайт проста неабходны!". І для таго, каб свае паслугі прарэкламаваць, і для таго, каб дадатковых спонсараў адшукаць для далейшага ўдасканалення, да прыкладу, Пагародненская кірмашу ці больш маштабнага развіцця мясцовай школы ткацтва.

Добра разумею і наступнае: каб стварыць форум ці сайт, з дапамогай якога можна мэтанакіравана прывабіць да сябе інвестара-спонсара, патрэбны на сёння менавіта спонсар-інвестар. Але ж відавочна і тое, што гэтая фандрайзінгавая задача па плячы толькі той установе, якая прэтэндуе на званне "Клуб года".

## Прыярытэты клубнай "вышэйшай лігі" Гродзеншчыны

# і турыстычны вектар развіцця

Шэсць мільёнаў за дзень

Спачатку — пра агульнараённыя прыярытэты. У Гродзенскім раёне таксама ёсць што паказаць турысту, у тым ліку замежнаму. І ўвогуле, як зазначыла намеснік начальніка ўпраўлення Гродзенскага аблвыканкама Алена Клімовіч, для вобласці гэты кірунак турыстычна-культурнага развіцця — таксама выключна важны. А ў Гродзенскім раёне турыстычных аб'ектаў — мора разліванае. Ну, калі не мора, дык Аўгустоўскі канал — дакладна. Працякае ён, як вядома, і па Польшчы, таму лучыць турыстычныя зоны абедзвюх краін. Мы яшчэ вернемся да канала, з дапамогай якога аддзел культуры Гродзенскага раёна ўтэўнена павышае сваю міжнародную творчую значнасць. А цяпер — пра тое, як за адзін дзень культработнікі раёна зарабляюць на турмаршрутах па 6 мільёнаў рублёў.

У Адэльскім цэнтры культуры і народнай творчасці апрача ўнікальнага драўлянага касцёла ёсць яшчэ і такая з'ява, як Адэльскія фэсты, што падтрымліваюцца грантамі трансгранічнага супрацоўніцтва. Прывабліваe гасцей і тое, што мясцовы майстар Мар'ян Скраблевіч выробляе дзіўныя духавыя інструменты. А яшчэ жыве тут традыцыя падвойнага ткацтва. У вёсцы Капцёўка знаходзіцца Алея камянёў. Індура — самы стары населены пункт раёна. Сапоцкін — самы набліжаны да Польшчы. А ля Навумавічаў захаваўся форт Першай сусветнай вайны, паблізу якога пад час Вялікай Айчыннай быў расстраляны разам з землякамі стваральнік Гродзенскага заапарка Ян Каханоўскі: наўмысна пайшоў на смерць, каб выратаваць адну з жанчын... І ўрэшце — 22 беларускія кіламетры судаходнага і аўтэнтычнага Аўгустоўскага канала.

Кантрабанда не пройдзе

Начальнік аддзела культуры Гродзенскага райвыканкама Ігар Лябецкі распавёў, што ўся інфраструктура гэтага воднага аб'екта з некранутай экасістэмай павінна адпавядаць старадаўнасці канала. Інакш кажучы, ніякіх гасцінічных гмахаў па берагах не ўзнікне, а вось драўляныя дамкі з комплексам бытавых паслуг пакрыце паўстаюць. Непадалёк ад шлюза і прыстані, ад якой курсіруе экскурсійны караблік, аддзел зладзіў "аўтэнтычную" сцэну, залу, дзе і платныя канцэрты адбываюцца, і танцавальныя вечары.

На канале бяспродна хіба толькі зімой — астатнім часам усе 22 водна-берагавыя кіламетры віруюць і турыстычным, і фестывальным жыццём. Калісь у гэтую святочную мітусню паспрабавалі, як распавядаюць, "упісацца" кантрабандысты (да Польшчы — некалькі кіламетраў): адправілі па падводнай плыні партыю цыгарэт — не атрымалася. Уходзіцкія пагранічнікі сітуацыю ў памежнай зоне адсочваюць пры дапамозе самых сучасных тэхнічных фодкаў. Кантрабандзе — заслона надзейная, а вось творчасці — зялёнае святло. З гэтай нагоды члены камісіі, аглядаючы з параходзіка маляўнічыя берагі, разважалі пра магчымасць феерычнай тэатралізацыі з удзелам "русалак", "лесавікоў" і "кікімар". Ігар Лябецкі запэўніў: "Усё будзе!"...

І адзін з наступных дзён надзвычай яскравых турыстычных аб'ектаў раёна — вёска Верцялішкі, пра якую напісала ўжо не адно пакаленне журналістаў. А колькі яшчэ напіша!

Рэвяка — за прагрэс!

Верцялішкі нагадваюць шляхетным аблічам (дый не толькі) добры абласны горад. Галоўная дзейная ("горадаўтваральная") асоба тут — кіраўнік СВК "Прагрэс-Верцялішкі", Герой Рэспублікі Беларусь Васіль Рэвяка. Ён навупрост уплывае на культуру сельгасвытворчасці, на культуру творчых зносін, а таксама — на кадравую палітыку, ад якой залежыць тутэйшы узровень жыцця і мастацтва... Мая б воля — я ўсоды вазіў бы кіраўнікоў сельгасарганізацый з усёй Беларусі, каб вучыліся тыя свой гонар мець: узнімаць не толькі вытворчасць, але і ўстановы культуры. Тады, відаць, і патрэба ў спонсарстве адпала б. А ў Верцялішках і моладзі шмат, і на жыццё чарга не спыняецца. Якая беларуская вёска можа гэтым пахваліцца?..

Аўгустоўскі канал — адметны пункт мясцовых турмаршрутаў.

## Верцялішкаўскі цэнтр культуры і вольнага часу:

# грашовы стымул за актыўнасць

**Найперш варта падкрэсліць, што ў Верцялішках аграгарадок узнік яшчэ за савецкім часам. Культура мясцовай сельгасвытворчасці тут спрадвек лічылася ўзорнай, а Гродзенскі раён з гэтай жа прычыны (бадай, адзіны ў вобласці) працуе без дзяржаўных датацый. Таму і Верцялішкаўскі ЦКіВЧ — кшталту гарадскога Палаца культуры. Тут дзейнічае 14 гурткоў і аматарскіх аб'яднанняў. Штогод праводзяць звыш 200 мерапрыемстваў. Прадастаўляюць 10 відаў платных паслуг. Пры гадавым плане ў 35 мільёнаў рублёў факт на сёння склаў больш за 80 мільёнаў.**

Начальнік аддзела культуры Гродзенскага райвыканкама Ігар Лябецкі ля сцэнічнай пляцоўкі на Аўгустоўскім канале.

Намеснік старшыні Гродзенскага райвыканкама Валерый Клімовіч сустракае членаў рэспубліканскай камісіі.

Тэатралізацыя ля Верцялішкаўскага цэнтра культуры і вольнага часу.

Намеснік старшыні Гродзенскага райвыканкама Валерый Клімовіч распавядае, што кіраўнік СВК выдатказаў сёлета на развіццё мясцовай культуры без малога 200 мільёнаў рублёў: не толькі на рамонты, але і на набыццё музычнай апаратуры, на мастацкія патрэбы народнага ансамбля песні і танца "Ніва" — найстарэйшага гурта раёна, дзе і работнікі культуры твораць, і рабочыя СВК.

Больш за тое: Васіль Рэвяка за кіраўнічы гонар лічыць і рэгулярную матэрыяльную стымуляцыю найбольш актыўных удзельнікаў народнай творчасці. Па словах дырэктара Цэнтра культуры Міхаіла Клачко, кожны з іх пастаянна атрымлівае персанальныя даплаты і прэміі. Словам, працаваць яскава ў Верцялішках — норма.

Чатыры фестывалі

Тэатралізацыя для мясцовых работнікаў культуры — з'ява звычайная. У той суботні дзень, да прыкладу, ля клубнай установы жыхары Верцялішак сабраліся для таго, каб паглядзець на "сустрэчу" Князя Гедыміна з Князем Давыдам Гарадзенскім. Мастацкі кіраўнік Аляксей Халікаў хвалявуся: ці ўсё атрымаецца так, як ён задумаў? Хваляванні былі дарэмнымі.

Вяселле ў Верцялішкаўскай клубнай установе.

Дырэктар Верцялішкаўскага ЦКіВЧ Міхаіл Клачко.

У аграгарадку ладзяць ажно чатыры знакавыя фестывалі, прысвечаныя і традыцыйнай беларускай культуры, і сучаснай маладзёжнай творчасці. Мясцовыя мастацкія калектывы пастаянна ўражваюць замежжа сваім майстэрствам. І ўсё гэта — таксама пры матэрыяльнай падтрымцы кіраўніцтва СВК.

Нам пашанцавала: мы паўдзельнічалі ва ўрачыстай рэгістрацыі шлюбу. Як расказаў дырэктар ЦК, гэтая паслуга — платная і шматфункцыянальная. Інакш кажучы, існуе некалькі варыянтаў правядзення абраду, і аплата — розная. Але культурнае суправаджэнне мерапрыемства — абавязковае. Таму і з планам платных паслуг тут спраўляюцца без асаблівых выкліпаў.

Дырэктарскія мары

Так, Цэнтр культуры і вольнага часу — установа шматфункцыянальная. Ёсць тут танцавальная і глядзельная залы, тэатральна-канцэртная сцэна, пакоі грымёрныя і для гурткоўай лы харэаграфічнай дзейнасці, касцюмерныя і трэнажорныя, а бібліятэка мае статус інфармацыйна-краязнаўчага цэнтра... Таму і нараджаецца тут процьма праектаў, якія вабілі і вабяць не толькі мясцовых жыхароў, але і шматлікіх турыстаў.

Аднак няма мяжы дасканаласці. Дырэктар Верцялішкаўскага цэнтра культуры і вольнага часу Міхаіл Клачко ўпэўнены, што ягоная ўстанова павінна мець свой транспарт. Неадкладнай неабходнасцю стала пастаянная замена светлавой і гукаўзмацняльнай апаратуры на больш сучасную. Дарэчы, асабіста я ў інтэрнэтаўскай прасторы не знайшоў сайта Верцялішкаўскага цэнтра культуры і вольнага часу. Вазьму на сябе смеласць аднесці яго будучую наяўнасць у лік мар Міхаіла Клачко...

Прадчуваю, што супрацоўнікі многіх сельскіх клубаў, якія і па сёння не маюць камп'ютараў, належнай колькасці народных калектываў, хоць і патрабавальных, але заўжды дбайных спонсараў, прачытаюць гэтыя радкі, даведаюцца пра сённяшнюю яву Верцялішак, пра мары дырэктара мясцовага ЦК і надоўга сапсуюць сабе настрой. І я цудоўна іх разумею.

Замест заключэння

Верцялішкі і Пагародна. Дзве гэтыя вёскі, набыўшы аграгарадоцкі статус, пераўтварыліся ва ўнікальныя паселішчы, адметныя спрадвечнай самабытнасцю ў яе сучаснай інтэрпрэтацыі. Так, культура названых мястэчак развіваецца ў адным кірунку, але дадзены працэс розніцца тэмпамі і маштабамі. Нацыянальнае ж мастацтва — тая кветка, што красуе на любой, нават не надта ўрадлівай, глебе. Я зараз — не пра "фінансавую" ўрадлівасць Воранаўскага і Гродзенскага раёнаў: нельга параўнаць непараўнальнае. Я пра тое, што абедзве клубныя ўстановы Гродзенскай вобласці — яркія, шчырыя і непаўторныя. Прынамсі, яны ведаюць над чым працаваць у перспектыве, які акцэнт рабіць ва ўзаемаадносінах са спажыўцом культуры. І гэтае веданне само па сабе каштуе надзвычай дорага і не можа не пераўтварыцца ў канкрэтны заўтрашні плён...

**Яўген РАГІН,**
**наш спецыяльны карэспандэнт**
**Мінск — Воранаўскі раён — Гродзенскі раён — Мінск**
**Фота аўтара**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ